# Эпоха ва ўспамінах народнага пісьменніка

**У галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі 31 студзеня ў 16.00 адбудзецца прэзентацыя мемуараў народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца.**

Мікалай Чаргінец — беларускі палітык, народны пісьменнік Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, ганаровы грамадзянін горда Мінска, уладальнік міжнародных прэмій, дзяржаўных узнагарод СССР, Рэспублікі Беларусь і іншых краін.

Пісьменнік прадставіць 4 кнігі з цыкла аўтабіяграфічных раманаў «Цяжкія дарогі жыцця», а таксама падзеліцца фактамі сваёй багатай біяграфіі, якія ўвойдуць у наступныя выданні. У мемуарах народны пісьменнік расказвае пра свой лёс, пра тое, з чаго пачыналася яго самастойнае жыццё. На старонках кніг — успаміны аб сям'і, аб тых выпрабаваннях, якія выпалі яго родным і блізкім у перыяд фашысцкай акупацыі Мінска.

Мікалай Чаргінец — відавочца і ўдзельнік шматлікіх знакавых падзей, чалавек, у біяграфіі якога адлюстравана цэлая эпоха. У творах ён дзеліцца ўспамінамі аб сваёй шматграннай дзейнасці — як супрацоўніка органаў унутраных спраў, удзельніка вайны ў Афганістане, шмат увагі надае футболу. Выданні праілюстраваны фатаграфіямі, якія даюць магчымасць адчуць асаблівасці мінулага стагоддзя, убачыць вялікіх дзеячаў Савецкага Саюза, даведацца пра побыт савецкіх людзей.

Да мерапрыемства будзе падрыхтавана выстаўка з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Аўтар прадставіць рэдкія экземпляры сваіх кніг. У прэзентацыі прымуць удзел пісьменнікі, моладзь, а таксама героі кніг.

**Марыя ЛІПЕНЬ**